# ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

УДК 378.4:[008+7](476-25)+929(476)Гуд П. А.

## СТВАРАЛЬНІК СВЯТА.
## ДА ДНЯ НАРАДЖЭННЯ П. А. ГУДА



*Восьмага студзеня споўнілася 70 гадоў Пятру Адамавічу Гуду, кандыдату гістарычных навук, прафесару, акцёру, рэжысёру, сцэнарысту, педагогу, этнографу, фалькларысту. Калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў сардэчна віншуе Пятра Адамавіча з юбілеем, жадае моцнага здароўя, творчага настрою, здзяйснення жаданняў, поспехаў на педагагічным, навуковым і творчым шляху, плённай працы на карысць Айчыны.*

Пётр Адамавіч Гуд – лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, свят, конкурсаў. Адзіны ў Беларусі першы лаўрэат Усесаюзнага фестывалю масавых свят (1982). Кандыдат гістарычных навук (1987), прафесар (2000). Член Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV).

Скончыў Харкаўскі дзяржаўны інстытут культуры (1973). Працаваў акцёрам (Беларускі і Адэскі тэатры юнага гледача – 1962–1963 гг.), артыстам драмы і салістам балета Украінскага рэспубліканскага ансамбля музычнай камедыі (Кустанай, Цалінаград, Чымкент), галоўным рэжысёрам тэатра-студыі ў Таласе (Кіргізія) і інш.

З 1977 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. 1993–2014 гг. загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Двойчы ўзнагароджаны ў намінацыі «Загадчык кафедры года».

Пётр Адамавіч – рэжысёр першага свята прысвячэння ў студэнты (1977) і першага справаздачнага канцэрта творчых калектываў Мінскага інстытута культуры (1978), а таксама зорных паходаў па месцах баявой і працоўнай славы і інш.

Выкладае дысцыпліны: «Традыцыйная святочная культура беларусаў», «Беларускія гульні», «Рэжысура традыцыйнага абраду», «Асновы драматургіі і сцэнарнае майстэрства», «Рэжысура абрадаў і свят», «Тэхналогія стварэння свята», «Піратэхніка ў свяце».

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ



П. Гуд – артыст драмы і саліст балета Украінскага рэспубліканскага ансамбля музычнай камедыі. Опера М. В. Лысенкі «Наталка Полтавка», роля Міколы. 1964 г.

Аўтар манаграфій «Тэхналогія стварэння свята» (2004, 2008), «Мастацтва феерверкаў» (2007).

Стваральнік навукова-педагагічнай школы ў галіне свят, унікальнай спецыялізацыі «рэжысура народнага свята».

Сярод вядомых вучняў Пятра Адамавіча У. М. Карачэўскі, Д. А. Гарэлік, Павел Усовіч, Алеся Ярмоленка, Яўген Блізнюк, М. К. Котаў, А. Л. Тушынская, А. В. Гайдукевіч, А. Я. Камінскі, Д. П. Сергейчук і інш.

Адзін з ініцыятараў і аўтараў адраджэння беларускіх свят, абрадаў і святочных кірмашоў. Сабраў, даследаваў і выдаў першы збор кірмашовых песень у манаграфіі «Беларускі кірмаш» (1996, з Н. Гуд). Сцэнарыі абрадавых свят апублікаваў у кнізе «Ад Каляд да Пакроваў» (2000), зборніках «Восеньскія святы» (1995), «Зімовыя святы» (1999), «Веснавыя святы (2000), «Летнія святы» (2001), метадычных дапаможніках «Свята касавіцы» (1983), «Зажынкі, дажынкі» (1986), «В русле народных традиций» (1986), «Спас – усяму час» (1994), «У гасцях у гаспадыні Прыроды» (2000), «Добры настрой» (2002), аўтарскіх метадычных работах «Свята лесу» (2006 ), «Свята кветак» (2009) і інш.

Аўтар шэрагу вучэбных праграм па святочна-абрадавай дзейнасці, рэжысуры народнага свята, беларускіх народных гульнях.

Мастацкі кіраўнік, рэжысёр-пастаноўшчык, сцэнарыст больш 400 творчых работ, сярод якіх: рэспубліканскія святы духавой музыкі (1977–1990, Мінск, Баранавічы), рытуал-эстафета алімпійскага агню і тэатралізаваны канцэрт «Факел дружбы» для ўдзельнікаў XXII Алімпійскіх гульняў (Мінск, 1980), тэатралізаваны канцэрт для ўдзельнікаў III Усесаюзных гульняў моладзі, (Мінск, 1982), сцэнарый свята беларускага сацыяльна-культурнага комплексу на XXII Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў (Масква, 1992), Усесаюзны футбольны турнір «Скураны мяч» (Мінск, 1985, 1988), Першы Усесаюзны турысцкі злёт навучэнцаў прафтэхадукацыі (Мінск, Маладзечна, 1985), культурная праграма беларускай дэлегацыі на Усесаюзных паходах камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы нашай Радзімы (Мінск-1980, Ерэван-1982, Ленінград-1987), феерверк на I Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці «Галасы дзяцінства» (Мінск, 1991) і інш. Галоўны рэжысёр-пастаноўшчык свят і святочных дзей у Беларусі, Польшчы, Літве, Латвіі, Украіне, Расіі, Арменіі, Абхазіі, Кіргізіі, Казахстане.

Упершыню ў Беларусі распрацаваў і ўвасобіў рэспубліканскае свята сучаснага бальнага танца («Мінскі баль-76»), Універсіяду бальнага тан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца (Мінск, 1994), тэатралізаваныя мітынгі-рэквіемы на мемарыяльных комплексах (Ушачы-1984, Быхаў-1985), беларускі кірмаш (Столін-1981); свята вёскі (в. Верцялішкі Гродзенскага р-на-1984), свята народных рамёстваў (Воранава-1984), свята аўтэнтычнага фальклору на Першым Міжнародным фестывалі фальклору ў Пінску (1994), сцэнарый Рэспубліканскага вандроўнага свята, прысвечанага 600-годдзю пасялення татар у Беларусі (Навагрудак, Смілавічы Мінскай вобл. і Іў'е Гродзенскай вобл., 1996), каляднае фальклорна-піратэхнічнае шоу (Мінск, 2000), Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (Паставы, 1994–2006), Усебеларускі фестываль народнага гумару (Калінкавіцкі р-н, 1994–2009), Усебеларускі фестываль нацыянальных культур (нацыянальныя падворкі) – Гродна, 1996–2012, адкрыты фестываль гульні Гродзенскай вобл. «Карнавал весялосці» (2006, 2012), а таксама Першы Міжнародны фестываль беларускай песні ў Польшчы (Беласток, 1992).



Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», г. Паставы. Галоўны рэжысёр – П. А. Гуд

За плённую творчую, спартыўную, навуковую, метадычную, выхаваўчую і педагагічную працу Пётр Адамавіч Гуд атрымаў больш за 100 узнагарод, сярод якіх граматы, памятныя знакі і медалі: медаль хакейнага турніру ЦК ЛКСМБ «Золотая шайба», медаль Усесаюзнага клуба ЦК ВЛКСМ «Кожаный мяч», медаль лёгкаатлетычнага марафону «Освобождение» (Харкаў), Ганаровая грамата ЦК ЛКСМБ, ганаровы знак ЦК ВЛКСМ «Дарогамі бацькоў-герояў», медаль «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения В. И. Ленина», ганаровы знак МУС СССР «Активист культурного шефства», ганаровы знак «60 лет Краснознаменного Западного пограничного округа», Ганаровыя граматы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Ганаровая грамата Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За плённую працу, вялікі асабісты ўклад у развіццё культуры і мастацтва Беларусі», Ганаровая грамата Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, юбілейны медаль «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», ганаровы знак і юбілейны медаль «95 лет пограничной службе Республики Беларусь».

За значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і тэатральнага мастацтва, высокае педагагічнае майстэрства і падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў у галіне культуры і мастацтва, актыўную грамадскую дзейнасць П. А. Гуд узнагароджаны ганаровым знакам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За высокія дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» і інш.

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ